вогненнай вёскі...» (1975) А.Адамовіча, Я.Брыля, У.Калесніка, «Блакадная кніга» (1985) А.Адамовіча і Д.Граніна, «У вайны — не жаночы твар» (1985), «Цынкавыя хлопчыкі» (1990), «Чарнобыльская малітва» (1998) С.Алексіевіч. З'явілася «спавядальная» проза вязняў канцэнтрацыйных лагераў (дзённікі, споведзі, успаміны Б.Мікуліча, С.Грахоўскага, Л.Геніюш, П.Пруднікава і інш.).

У Г.п. 2000-х гг. побач з рэаліст. узнаўленнем мінулага (творы В.Коўтун, А.Федарэнкі, Я.Сіпакова, А.Бутэвіча) назіраецца яго мадэрнізацыя (раманы і аповесці Л.Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла», 2001; «Пярсцёнак апошняга імператара», 2002; «Золата забытых магіл», 2004; «Скокі смерці», 2005; А.Наварыча «Літоўскі воўк», 2005).

*Т.К.Грамадчанка.*

**ГІСТАРЫЧНАЯ ШКОЛА**, кірунак у рускай фалькларыстыцы ў канцы 19 — пач. 20 ст. Узнікла ў выніку крызісу кампаратывістыкі (параўнальнага літ.-знаўства) і міфалагічнай школы. Метадалогія Г.ш. сфармулявана У.Ф.Мілерам у «Нарысах рускай народнай славеснасці» (т. 1, 1897). Прыхільнікі Г.ш. (М.Н.Сперанскі, Б.М. Сакалоў, С.К.Шамбіны і інш.) развілі і дапоўнілі канцэпцыю гіст. падыходу да вывучэння фальклору. Вял. ўвага надавалася пазнанню гіст. побыту народа; ролі індывід.-асабовага пачатку ў фальклоры. Змены і адхіленні ад гіст. рэальнасці ў вуснай нар. творчасці тлумачыліся скажэннем адлюстравання мінуўшчыны пры вусным пераказе.

У бел. фалькларыстыцы метады Г.ш. адлюстраваліся пачынаючы з 1840-х гг. у працах І.Я.Храпавіцкага, М.А.Янчука, Я.Ф.Карскага. Сваё існаванне спыніла пасля 1917.

*І.М.Гоўзіч.*

**ГІСТАРЫЧНЫ ЖАНР** у выяўленчым мастацтве, адзін з асноўных жанраў жывапісу, графікі і скульптуры. Цесна звязаны з *батальным жанрам*, *партрэтам*, *пейзажам*, *бытавым жанрам*. Вытокі Г.ж. ў бел. мастацтве 15 ст. (мініяцюры Радзівілаўскага летапісу, роспісы замкавай капліцы ў Любліне, выкананыя бел. мастакамі). У 16 ст. створаны гіст. кампазіцыі «Бітва пад Оршай» (1515, невядомы аўтар), «Турнір рыцараў» А.Віта (1546), у кніжных гравюрах Ф.Скарыны і інш. У 17—18 ст. у серыі карцін прыдворны мастак Радзівілаў А. ван Вестэрфельд адлюстраваў гісторыю задушэння казацкіх паўстанняў і ваен. паходаў Я.Радзівіла («Уезд Я.Радзівіла ў Кіеў у 1651 годзе», «Асада Бабруйска войскамі Я.Радзівіла»). З 1-й пал. 18 ст. Г.ж. развіваецца ў дэкар.-прыкладным мастацтве: гіст. падзеі былі ўвасоблены ў *карэліцкіх шпалерах*, роспісах Мікалаеўскай царквы і Станіславаўскага касцёла ў Мсціславе, гравюрах Т.Макоўскага і інш. У 19 ст. развіццё Г.ж. было звязана з ідэямі асветніцтва і рамантызму і прадстаўлена творчасцю жывапісцаў К.Альхімовіча, К.Бароўскага, В.Ваньковіча, Я.Дамеля, В.Дмахоўскага, І.Аляшкевіча, А.Ромера, Я.Сухадольскага, І.Трутнева; графікаў М.Э.Андрыёлі, М.Кулешы, М.Падалінскага; скульптара Я.Астроўскага). У пач. 20 ст. вядучае месца займала гісторыка-рэв. кампазіцыя, дзе



*Да арт. **Гістарычны жанр**. І.Ахрэмчык. Абаронцы Брэсцкай крэпасці. 1957—58.*